Бібліятэка БДУКМ

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ
АБ'ЯДНАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ЛІТАРАТУРНЫХ МУЗЕЯЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ
РЭСПУБЛІКАНСКІ ФОНД ІМЯ БРАТОЎ ГАРЭЦКІХ
БЕЛАРУСКАЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АКАДЭМІЯ
ГОРАЦКІ ГІСТОРЫКА-ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ

# ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДАКЛАДАЎ І ПАВЕДАМЛЕННЯЎ ШОСТЫХ ЧЫТАННЯЎ

***(г. Горкі, 18—20 чэрвеня 1997 г.)***

Рэпазіторый БарГУ

20

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага універсітэта культуры
Інв. N 324067

Мінск 2000

ПРАВЕРАНА
20 15
БІБЛІЯТЭКА БДУКМ

*Уткевіч В.* Архетып дома і сялібы ў творчасці М.Гарэцкага і К. Гамсуна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
*Шаўлякова І.* Феномен метатропа ў "Скарбах жыцця" М. Гарэцкага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
*Якавенка Н.* Раман М. Гарэцкага "Віленскія камунары" ў перакладах на рускую мову . . . . . . . . . . . . . . . 98
*Барадзіна А.* Міжпрадметныя сувязі з гісторыяй пры вывучэнні жыццёвага і творчага шляху Максіма Гарэцкага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
*Баранава А.* Вобраз настаўніка ў творах Максіма Гарэц-Кага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
*Запартыка Г.* Драматычныя абразкі М. Гарэцкага . . . . 116
*Кныш Л.* Сродкі вуснага маўлення ў творах М. Гарэцкага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
*Лісоўская І., Антонава С.* Моўная карціна свету ў наратыўным тэксце (па раману М. Гарэцкага "Віленскія камунары") . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
*Малько Г., Леўшава В.* Месца і роля фальклорных паданняў у творах Максіма Гарэцкага . . . . . . . . . . 138
*Маслоўская Т.* Лёс Бацькаўшчыны і яе сыноў у аповесці М.Гарэцкага "Ціхая плынь" . . . . . . . . . . . . 142
*Новік М.* Мастацкія сродкі ўвасаблення лёсу Беларусі ў апавяданнях Максіма Гарэцкага "Усебеларускі з'езд 1917-га года" і "Фантазія". . . . . . . . . . . . . . 150
*Пераходзька С.* Ацэначныя назвы асобы ў творах М.Гарэцкага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
*Санюк Дз.* Феномен нацыянальнага месіянізму ў творчасці М. Гарэцкага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
*Скалабан В.* Проза Максіма Гарэцкага як гістарычная крыніца (на матэрыяле апавядання "Усебеларускі з'езд 1917-га году"). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
*Сучкоў К.* М. І. Гарэцкі аб інтэлектуальным развіцці студэнтаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
*Ціханавецкая В.* Матэрыялы сям'і Гарэцкіх у фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.185
*Шаладонаў І.* Канфлікт агульнага і прыватнага ў апавяданнях М. Гарэцкага дваццатых гадоў . . . . 188

Рэпазіторый БарДУ

своей працы над раманам Гарэцкага ён звяртаўся да жонкі пісьменніка Л. У. Чарняўскай-Гарэцкай з просьбамі растлумачыць незразумелае. Але яго пераклад «Віленскіх камунараў» усё ж такі не быў выкананы на належным узроўні.

А што датычыць «Виленских воспоминаний» М. Гарэцкага, то гэты твор каштоўны для нас і тым, што адкрывае іншчэ адну старонку дзейнасці пісьменніка як перакладчыка, і тым, што захоўвае ў сабе сутнасць стылю, светабачання, выяўлення яго асобы і творчай індывідуальнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Абабурка М. Мова твораў Максіма Гарэцкага // Роднае слова. 1993, № 8.

2. Бугаёў Д. Максім Гарэцкі. Мн., 1968.

3. Гарэцкі М. Віленскія камунары. Мн., 1965.

4. Горецкий М. Избранное. Мн., 1989.

5. Дасаева Т. М. Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага. Мн., 1993.

6. Кенька М. Пераклаў Максім Гарэцкі... // Братэрства'85. Мн., 1985.

7. Чыгрын І. Паміж былым і будучым. Мн., 1994.

Алена Барадзіна (Баранавічы)

## МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ З ГІСТОРЫЯЙ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ЖЫЦЦЁВАГА ШЛЯХУ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Творы мастацкай літаратуры заўсёды адлюстроўваюць канкрэтныя асаблівасці гістарычнай эпохі, у якую яны былі створаны. Гэта вызначае шматбаковыя сувязі літаратуры з курсам гісторыі. Міжпрадметныя сувязі ажыццяўляюцца на ўроках, прысвечаных вывучэнню жыццёвага і творчага шляху пісьменніка, аналізу літаратурнага твора, разбору літаратурна-крытычных артыкулаў. Далучэнне гістарычнага матэрыялу ў працэсе работы над манаграфічнай

тэмай дазволіць паказаць адрозненне мастацкага адлюстравання рэчаіснасці ад навуковага, гістарычнага выкладання.

Уласна, праблема міжпрадметных сувязей у школьным выкладанні літаратуры зусім не новая і, бадай, перастала шмат у чым быць менавіта праблемай, перакачаваўшы ў раздзел патрабаванняў, прад'яўляемых да ўрока. І натуральным вынікам такога становішча з'яўляецца адсутнасць у школьнікаў цэласнага ўяўлення пра свет, няпэўнасць асобасных пазіцый, імкненне да пасіўнага сузірання, індывідуалізм.

Імкнучыся пераадолець гэтыя адмоўныя тэндэнцыі, варта памятаць, што літаратура ні ў якім разе не з'яўляецца ілюстрацыяй да гістарычнай падзеі, аднак тым не менш дапамагае пранікнуць у сутнасць гістарычнага працэсу: яна акцэнтуе сваю ўвагу на характарах людзей, народным духу, мадэлюе адэкватныя той ці іншай эпосе этыка-псіхалагічныя катэгорыі. Таму пры вывучэнні таго ці іншага твора ўвагу варта засяродзіць не столькі на гістарычным дэкоры, колькі на перажыванні чалавекам гістарычнага працэсу. Для героя твора гістарычны працэс — гэта само перажываемае ім жыццё. Нездарма сказана: спачатку было жыццё, а ўжо потым яно стала гісторыяй. А ступень усведамлення значнасці падзей залежыць ад ступені чалавечнасці героя.

Рабіць упор трэба на тым, што збліжае чытача і героя твора; менавіта тады гісторыя паўстане не як ланцуг аддаленых у часе падзей, якія здаюцца адцягненымі і нерэальнымі, а як непарыўны працэс, у якім як роўныя ўдзельнічаюць папярэднікі і сучаснікі.

Біяграфія мастака слова — гэта не набор асобных, ізаляваных фактаў з яго жыцця і творчасці. Мэта ўрокаў, прысвечаных біяграфіі пісьменніка, — ажывіць аблічча мастака, выклікаць цікавасць да яго асобы, поглядаў, ідэалаў, сумненняў. Але асоба пісьменніка неаддзельная ад эпохі, ад тых гістарычных падзей, сведкам і ўдзельнікам якіх ён быў. Таму славеснік не проста абапіраецца на гістарычныя веды навучэнцаў, яго задача — ажывіць гістарычныя падзеі, паказаць, як жыццё эпохі можа быць прапу-

Рэпазіторый БарДУ

шчана праз сэрца чалавека. А праз яго жыццё мы лепш пазнаем эпоху.

Работу па адбору матэрыялу, які дапаможа звязаць гістарычную навуку з літаратурай, можна весці ў наступных напрамках:

* вывучэнне гістарычных дакументаў эпохі, лістоў, дзённікавых запісаў, успамінаў сучаснікаў, публіцыстыкі таго часу;

* знаёмства з фактамі жыцця пісьменніка, якія даюць уяўленне пра яго непасрэдны ўдзел у грамадскім жыцці краіны;

* выяўленне сувязі паміж творамі мастака слова і надзённымі на той час пытаннямі.

Самую пільную ўвагу сёння выклікаюць трагічныя старонкі гісторыі XX ст., эпохі сталіншчыны, факты якой замоўчваліся, хаваліся, знішчаліся, але немагчыма сцерці чалавечую памяць.

Вялікую цікавасць уяўляе мемуарны жанр, бо цалкам абапіраецца на асобу аўтара; нават гістарычныя факты ён падае часам нечакана, у многім зусім не так, як пра гэта прынята пісаць і думаць.

«Чалавек чалавеку — воўк... Калі ты гаворыш з другім чалавекам, то павінен добра падумаць над кожным сваім і яго словамі, каб не зрабіць шкоды сабе і, магчыма, другім. Не пачынай ніколі размовы з незнаёмым, калі не ведаеш, хто гэта — ён можа быць вашым аднадумцам, але не адкрыецца перад вамі з асцярогі, але ён можа трымацца і супрацьлеглых поглядаў, а падаць сябе за аднадумцу, каб высачыць вас і зрабіць адпаведныя высновы. А таму не з кожным можна размаўляць, як душа з душой — хіба што пра заўтрашняе надвор'е... Будзьце хітрымі, не адкрывайце сваю душу, а калі спатрэбіцца, то пастарайцеся выглядаць не тымі, кім вы ёсць на самой справе... Так я гавару, і я ведаю, што гавару»[1]. Сёння маем усе падставы назваць гэтыя развагі аўтара памяткай, алгарытмам зносін для больш наіўнага сучасніка з пакалення 30-х.

---

[1] Т. Іванаўскас. Выбранае з успамінаў // ЛіМ. 1995, 3 лістапада.

У чым жа памыліўся, што зрабіў не так Максім Гарэцкі, арыштаваны 18 ліпеня 1930 года? Бадай, дакладнага адказу на гэтае пытанне не даў бы і сам Максім Іванавіч бо, па выразу Радзінскага, логіка таго часу была д'ябальскай, абсурднай. Яна хутчэй была ў адсутнасці ўсялякай логікі. Праўда, пэўнае меркаванне складваецца пры знаёмстве з кнігай Таццяны Дасаевай «Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага», мова якой — гэта мова ўспамінаў і дакументаў, у тым ліку дакументаў з закрытых архіваў КДБ. Пачаткам канца можна лічыць падзеі 1919 года: «З пераездам рэдакцыі «Звязды» ў Вільню туды пераехаў у лютым і Максім» (з успамінаў Г. І. Гарэцкага). «Раптоўны захоп горада польскімі войскамі... перашкодзіў Гарэцкаму вярнуцца ў Савецкую Беларусь». Гэты зварот адбыўся ў 1923 г., а да яго Гарэцкі адбыў зняволенне ў Лукішках, быў «без суда, са здзекам, выкінуты з Вільні ў нейтральны пас паміж польскім і літоўскім фронтам». Падставай для гэтага была, безумоўна, беларуская справа, а фармальнае абвінавачванне — «у прыналежнасці да партыі камуністаў» і да т. п.

Вярнуўшыся на радзіму, Гарэцкі, як і многія іншыя, быў поўны намераў будаваць Беларускі Дом. Але ў нетрах ГПУ ўжо выспеў цыркуляр, які толькі на самы першы погляд не меў адносін да лёсу пісьменніка, а датычыў беларускіх дзеячаў перыяду БНР: «...элементы, якія вяртаюцца з-за мяжы, не могуць быць ні карыснымі, ні пажаданымі для Савецкага Саюзу — да іх трэба стасаваць спрошчанае і прыспешанае следства і расстрэльваць паводле загаду ГПУ».

Гэты загад уваходзіць у дзеянне 17 кастрычніка 1925 года. Тэкст яго надрукавала «Наша слова» паводле публікацыі ў эміграцыйнай газеце «Беларускі Голас» у лютым 1956 г. у перакладзе з расійскай мовы.

Абвінавачванне, прад'яўленае Гарэцкаму 10 красавіка 1931 г., гучала так: «...в период с 1924 г. по день ареста состоял в литературной группе к/р организации «СВБ» и проводил задачи этой организации».

Пры паўторным арышце ў абвінаваўчым заключэнні 1937-га года чытаем: «В 1930 г. был осужден коллегией ОГПУ на 5 лет лишения свободы как руководитель «Союза вызваления Украины». Больш чым красамоўная ілюстрацыя да тагачаснага ходкага выразу: «Был бы человек, а дело найдется». Пры вывучэнні гэтага і падобных да яго дакументаў эпохі сталіншчыны выразна вымалёўваецца тэзіс: «Каб падпарадкаваць народ, трэба або знішчыць, або купіць яго інтэлігенцыю. А яшчэ лепш — адну частку знішчыць, а другую купіць і трымаць у страху».

Аднак такія, як Гарэцкі, не страцілі ўласнай годнасці, не далі паказанняў ні на сябе, ні на другіх, ні ў чым не пакаяліся.

«Віноўным сябе не прызнаў»,— чытаем у справе № 20951-с.

Заняткі, праведзеныя з выкарыстаннем такіх дакументаў у форме эмацыянальнага настаўніцкага слова, спрыяюць таму, што навучэнцы ўважлівей углядаюцца ў лёсы і характары пісьменнікаў і літаратурных герояў, суадносяць іх маральныя ўстаноўкі з сучаснымі пазіцыямі.

Ні адзін значны эпізод з жыцця пісьменніка не можа разглядацца ў адрыве ад гісторыі, ад тых падзей, сведкам і ўдзельнікам якіх ён быў. Веданне жыцця пісьменніка — гэта веданне той эпохі, якая адбілася ў яго біяграфіі і творчасці. З лістоў М. Гарэцкага да сям'і паўстае «сцюжная» эпоха, аб якой потым так лаканічна і красамоўна раскажа Васіль Быкаў. «Клапачуся толькі, што вам і бацькам цяжкавата жыць, але за сэрца мяне гэта ўжо не хапае, — так што і вы плаціце мне тым самым і патрошку сцюдзянейце да мяне...» «Часам находзіць на мяне вялікая злосць і крыўда, што фактычна адкінулі мяне ад літарацкае работы, як апошнюю непатрэбшчыну. Бо ці ж магу я ў сваіх цяперашніх умовах пісаць?» Такі ж крык душы мы пачуем пазней, са старонак «Дзённіка» К. Чорнага: «Я жыву, як апошняе пакідзішча..., гіну і не магу выкарыстаць як бы трэба было свой талент. Сілы мае трацяцца і марнуюцца без карысці...» Даўно стала аксіёмай, што жыццё і творчасць для пісьменніка — паняцці раўназначныя.



Рэпазіторый БарДУ

«Спрабую пісаць, але нешта туга пішацца». «Канчаю апрацоўваць «Камунараў». Цяжка мне іх пісаць да друку, усё баюся, каб не зрабіць якой памылкі ў асвятленні». Страх спараджаўся тэрорам, страх быў адзіны для ўсіх і, у сваю чаргу, павінен быў спараджаць аднадумнасць. Галоўным жа метадам тэрору з'яўляліся масавыя рэпрэсіі. Апанаваны гэтым жа пачуццём, у свой час Чарот напісаў у прадмове да перавыдання зб. «Завіруха» (1929), што чытач дарэмна будзе шукаць у ёй акрэсленай мастацкай (чытай: палітычнай) праграмы, яе няма. Відаць, паэт вырашыў, што лепш праграмы не мець, чым аб'явіць, а яна акажацца не тою. Але «лініі» патрабавалі. І М. Чарот выступае з вершам «Суровы прыгавор падпісваю першым», але адцягнуць такі ж прыгавор ад сябе змог ненадоўга... Максім Гарэцкі нічым падобным свайго сумлення не заплямiў. Узняцца да маральнай вышыні пісьменніка як чалавека і адчуць непаўторнасць яго майстэрства дапамагаюць яго лісты з Вяткі, дзе ён быў бяспраўнай істотай, ледзь зводзіў канцы з канцамі, але ўсё ж і ў такіх умовах здолеў узяцца за творчую працу.

Нягледзячы на «сцюжу», захаваў цяпло, любоў і клопат аб сваіх родных: «Добры вечар, Цярплівая Ласка! Добры вечар, парасткі малыя!» — гэты шчымлівы зварот не можа пакінуць абыякавым ніводнае неачарсцвелае сэрца...

«У біяграфіі пісьменніка галоўнае — творчасць; але — ажыві чалавека; прымусь убачыць не толькі жывога чалавека, але і ажыўшую разам з ім эпоху. Жывы сярод жывых і патрэбны сённяшнім людзям, сённяшняму дню — вось які́м павінен паўстаць перад школьнікам пісьменнік» (Т. Ф. Курдзюмава).

Актуальная педагагічная праблема міжпрадметных сувязей урокаў літаратуры і гісторыі павінна сёння разглядацца неаднабакова, не толькі як выкарыстанне асобных гістарычных звестак для тлумачэння творчасці пісьменніка ці зместу твора, а комплексна, як сукупнасць форм, прыёмаў і відаў работы па фарміраванню сістэмы гістарычных ведаў і поглядаў, якія дазваляюць з дастатковай глыбінёй



Рэпазіторый БарДУ

разбірацца ў літаратурных з'явах, а праз іх глыбей пазнаваць рэчаіснасць.

Ала Баранава (Мінск)

## ВОБРАЗ НАСТАЎНІКА Ў ТВОРАХ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

У творах М. Гарэцкага акрэслены драматычны, нават трагічны вобраз настаўніка, у якога не было гармоніі ні ў душы, ні з навакольным асяроддзем, ні з людзьмі, ні з жыццём. Таму так балюча ўспрымаюцца стогны душы пісьменніка, які ўвабраў у сябе боль прыніжаных, знявечаных, абражаных. Ён нездаволены, вельмі нездаволены! «Як толькі стаў я мець сваё сумленне, маю вялікую ахвоту, думку сэрца, як бы выпаўзці самому і другіх вызваліць з гэтага жыцця. Бо ў ім навакол адны аграмадныя, гідкія камы бруду, бруду дрэннага, гнойнага... Я не хачу трываць! І не вытрываю, бо нельга вытрываць. Я скіну, сарву ланцугі свайго старога жыцця і зраблю жыццё новае. Зраблю! Парву ланцугі спрадвечнай гульні-лені, ланцугі глуму, шальмоўства і страшэннай, аграмаднай цемнаты векавечнай, тыя ланцугі, што робяць з чалавека скаціну, быдлё, што твораць «паноў» і «мужыкоў». Ланцугі гэтыя выдумаў хіба сам Люцыпыр, скаваў іх у сваёй кузні і скрыўдзіў імі ўсіх людзей усяго свету, што жылі і паўміралі, што мадзеюць і цяпер, хварэючы ад гэтых ланцугоў... Няможна, няможна! Гэтак не павінна быць і не можа быць!..» — пісаў пісьменнік. Ёсць станоўчы вобраз сапраўднага настаўніка, настаўніка, які вучыць разважаць, бачыць і разумець жыццё, не скарацца бруду і брыдотам, — сам пісьменнік, аўтар праніклівых радкоў, якія не даюць супакойвацца, непакояць душу. Гэта сам Максім Гарэцкі.

А як жа жыве звычайны настаўнік, як ён адносіцца да гэтага бруду, ці не захліснуў гэты бруд яго, настаўніка, які павінен свяціць іншым, пераўтвараць жыццё, клікаць да



Рэпазіторый БарДУ